# Колькі Бурмістронкаў змагалася

*Чарговы працоўны дзень скончыўся, але настойлівы тэлефонны званок прымусіў затрымацца ў дзвярах. У нашай прафесіі - гэта паказчык чагосьці тэрміновага і важнага.*

## Нараджэнне сенсацыі?

- Добры дзень, нядаўна мы даведаліся, што ваша газета напісала пра майго цесця. Дзе знайсці нумар, каб прачытаць артыкул? - прамовіў прыемны мужчынскі голас. Што ж, з такімі пытаннямі да нас звяртаюцца перыядычна. Спрабую дацягнуцца да падшыўкі, але пачутае далей прымушае застацца на працоўным месцы: - Яго прозвішча Бурмістронак.

Гаворка ішла пра напісаны мною матэрыял «Там, дзе ручай у цішы світанак сустракае...» («НС» № 19 ад 6 мая 2016 г.), які паклаў пачатак серыі артыкулаў пра батальён Канстанціна Уладзімірава. Уладзімір Піліпавіч Бурмістронак - напэўна, самая загадкавая асоба сярод байцоў. Нагадаю, што першапачаткова пра яго вядома нямала. Праўда, уся інфармацыя супярэчлівая. Да прыкладу, адны крыніцы паказваюць, што ён - курсант Мінскай школы міліцыі, іншыя - старэйшы оперупаўнаважаны аддзела крымінальнага вышуку УРСМ УНКУС Магілёўскай вобласці, якога адклікалі з адпачынку. У адным выпадку ён малодшы лейтэнант, у другім - сяржант, у трэцім - старшына. Адзін даследчык сцвярджае, што ён быў смяротна паранены ў апошняй атацы, у якую падняў байцоў камандзір, іншы - што выйшаў з акружэння і партызаніў у Бярэзінскім раёне.

Прызнаюся, у мяне тады ўзнікла падазрэнне, што гаворка ідзе пра двух розных людзей. Аднак выказаць яго не асмелілася, бо агучыла не менш адважную здагадку, якая выклікала сумненні ў некаторых даследчыкаў - афіцэр выжыў у ваеннай мясарубцы, працягнуў службу ў органах унутраных спраў, узначальваў Бярэзінскі і Лагойскі РАУС. Хай прозвішча, імя і імя па бацьку героя вайны цалкам супадаюць з дадзенымі начальніка міліцыі, хай у кнізе «Прызванне служыць людзям», выдадзенай пад рэдакцыяй ужо былога намесніка начальніка Бярэзінскага РАУС падпалкоўніка міліцыі ў запасе Аляксандра Казюкі, удава начальніка РАУС, распавядаючы пра подзвігі мужа, згадвае і пра яго прысутнасць у батальёне Канстанціна Уладзімірава, але ў асабістай справе афіцэра няма пра гэта ні слова. На жаль, вясной пагутарыць з роднымі кіраўніка райаддзелаў не ўдалося - ні яго ўдавы, ні сына ўжо не было ў жывых. Звестак пра іншых дзяцей у Беразіно не мелі. Не хапіла часу і на дэталёвае вывучэнне асабістай справы - па маёй просьбе кіраўнік ветэранскай арганізацыі УУС Міншчыны падпалкоўнік міліцыі ў адстаўцы Уладзімір Дарашэвіч шукаў адказ толькі на адно канкрэтнае пытанне - пра знаходжанне ў шэрагах батальёна міліцыі. Але тэлефонны званок даказаў, што ў гэтай справе яшчэ рана ставіць кропку.

- Ваш артыкул чыталі нашы сваякі. У ім ёсць некаторыя недакладнасці, - трубку ўзяла жонка званіўшага Раіса Уладзіміраўна Коваль, у дзявоцтве Бурмістронак. - Мой бацька, Уладзімір Піліпавіч, быў афіцэрам, служыў оперупаўнаважаным у Магілёве. Калі пачалася вайна, яго сапраўды адклікалі з адпачынку. Потым ён ваяваў пад кіраўніцтвам Канстанціна Уладзімірава ў наваколлі вёсак Гаі і Старое Пашкова. Выжыў. Разам з татам у міліцэйскім батальёне быў яго малодшы брат - курсант Мінскай школы міліцыі Павел Піліпавіч Бурмістронак, які загінуў. Быў там і яшчэ адзін брат - Міхаіл Піліпавіч. Пра яго мала ведаю. Увайшоў у лік 19 байцоў, якія выжылі. Нейкім чынам трапіў у дзеючую армію. Пасля вайны прыязджаў да бацькі ў Беразіно, потым адправіўся кудысьці на поўдзень...

Раіса Уладзіміраўна прыйшла ў рэдакцыю, каб расказаць пра невядомыя факты з жыцця бацькі. Прыйшла не адна, а з унукам Аляксандрам. Вочы гэтага васьмігадовага хлапчука, якога ніколі не бачыла раней, падаліся да болю знаёмымі. Вядома ж! Менавіта так з пажоўклых фотаздымкаў глядзіць яго прадзед. Пазней расказ стрыечнай сястры дапоўніла Галіна Паўлаўна Багатка - дачка Паўла Піліпавіча. Таксама дапамагалі разабрацца ў перыпетыях гэтай заблытанай гісторыі Уладзімір Дарашэвіч і старшы інспектар па асобых даручэннях групы міжнароднага супрацоўніцтва Магілёўскага інстытута МУС падпалкоўнік міліцыі Аляксей Цюцюнкоў, які займаецца пошукавай працай у ведамаснай ВНУ.



Уладзімір Бурмістронак (другі рад, трэці злева) з сям`ёй

## Браты

У двух шлюбах у Піліпа Бурмістронка было 13 сыноў і дачок. Мы павядзем гутарку ў асноўным пра дзяцей яго другой жонкі Праскоўі. Дачкі Хадося і Сафія нарадзіліся ў 1905 і 1907 гадах. У 1909-м з'явіўся на свет Уладзімір, праз тры гады - Павел, яшчэ праз пяць - Міхаіл. Даты нараджэння Мікалая адрозніваюцца. У адным выпадку згаданы 1915-ты, у другім - 1920-ты. Дарэчы, бацька памёр досыць маладым - у 1921-м, калі яму было ўсяго 39 гадоў, таму ўсе клопаты па выхаванні дзяцей ляглі на плечы Праскоўі Дзям'янаўны.

Прайшоўшы ў 1934 годзе навучанне ў 2-м асобным радыёбатальёне (Смаленск), Уладзімір Бурмістронак камандаваў аддзяленнем у адной з вайсковых частак. У тым жа годзе ён стаў каптэнармусам кароткатэрміновых курсаў, а пазней - 78-га кавалерыйскага ўзвода рабоча-сялянскай міліцыі ў Магілёве. Затым служыў там жа міліцыянерам. У 1937 - 1938 гг. быў курсантам 15-й Мінскай школы РСМ НКУС БССР. Далей яго служба праходзіла ў Магілёве. Быў участковым інспектарам 1-га гарадскога аддзялення міліцыі, праз некалькі месяцаў прызначаны памочнікам упаўнаважанага крымінальнага вышуку. У 1939-м ён ужо оперупаўнаважаны. Апошняе перадваеннае прызначэнне адбылося ў сакавіку 1941 года - старшы оперупаўнаважаны аддзела крымінальнага вышуку ўпраўлення РСМ Магілёўскай вобласці. Дарэчы, гэтая пасада цалкам супадае з той, якую займаў Уладзімір Бурмістронак, што ваяваў у батальёне міліцыі. Гэта яшчэ раз пацвярджае, што перад намі адзін і той жа чалавек.



Павел і Вера Бурмістронкі

Як распавядае Галіна Паўлаўна Багатка, яе бацька заўсёды цягнуўся за старэйшым братам. І пагоны надзеў па яго парадзе. Жонку Павел знайшоў у Чашніцкім раёне. У вайсковай частцы, дзе служыў, яму запала ў душу Вара, якая працавала там поварам. Неўзабаве маладыя пажаніліся. Галіна, якая нарадзілася за два гады да пачатку вайны, - іх другое дзіця. Жонка заўсёды ішла за мужам, куды б яго ні закідвала служба. Аднак восенню 1940 года Павел адвёз жонку, цяжарную трэцім дзіцём, да сваёй маці, у вёску Валоўніца, што ў Бярэзінскім раёне. Мясцовыя чамусьці сталі клікаць маладую жанчыну Верай. З часам яна так прывыкла да гэтага імя, што пасля вайны, атрымліваючы дакументы замест згарэлых, запісалася менавіта так.

- Калі яны расставаліся, тата абяцаў неўзабаве забраць сям'ю да сябе. У 1941 годзе ён павінен быў скончыць Мінскую школу міліцыі імя М. Фрунзэ. У практычным падраздзяленні яму нібыта абяцалі даць кватэру. Аднак гэтым планам перашкодзіла вайна. Мама так і не зразумела, як яму ўдалося ў апошнія дні чэрвеня прыйсці ў вёску, каб развітацца. Ён забег на некалькі хвілін. Тады ж упершыню ўзяў на рукі сямімесячнага сына Толю. Тата нібы адчуваў, што яго сям'і можа пагражаць бяда, таму сказаў жонцы, каб называла не яго прозвішча - Бурмістронак, а сваё дзявочае - Астапчык. Потым абняў маму, мяне, сястру, брата і паспяшаўся з таварышам даганяць сваё падраздзяленне, - успамінаючы апошняе спатканне з бацькам, Галіна Паўлаўна ледзь стрымлівае слёзы.

Супрацоўнікі і курсанты Мінскай школы міліцыі атрымалі загад поўным складам адступаць да Магілёва. Ад дарогі паміж сталіцай і абласным цэнтрам да вёскі Валоўніца - менш за 15 кіламетраў. Магчыма, Павел развітваўся з сям'ёй з дазволу кіраўніцтва. А з братам Уладзімірам сустрэўся, хутчэй за ўсё, ужо ў міліцэйскім батальёне Канстанціна Уладзімірава.

Да вайны Уладзімір Піліпавіч жыў з сям'ёй у Магілёве. Ён быў шчаслівы ў шлюбе. Вельмі любіў жонку Марыю, пра прыгажосць якой яшчэ доўга ўспаміналі ў вёсцы. У пары падрасталі сын і дачка. У чэрвені 1941-га старэйшы Бурмістронак насіў званне сяржанта, якое атрымаў, як сведчыць асабістая справа, у 1939-м. Захаваўся і загад ад 3 чэрвеня 1941 года, падпісаны наменнікам начальніка АК УНКУС Магілёўскай вобласці па кадрах малодшым лейтэнантам дзяржбяспекі Крыловым, згодна з якім старэйшы оперупаўнаважаны АКВ упраўлення міліцыі сяржант міліцыі Бурмістронак У. П. лічыўся ў чарговым адпачынку з 28 мая па 27 чэрвеня 1941 года. Лейтэнантам ён стаў пазней - у лютым 1943-га, калі быў начальнікам асобага аддзела партызанскага атрада № 20.

Пасля нападу Германіі на Савецкі Саюз Уладзіміра Піліпавіча з гэтага самага адпачынку адклікалі, і ён змагаўся з акупантамі ў групе першага гарадскога аддзялення міліцыі, якой кіраваў разам з Ільёй Галкоўскім. Дарэчы, пад кіраўніцтвам Ілы Іванавіча Бурмістронак служыў да свайго апошняга перадваеннага прызначэння. Намаганнямі групы былі вылічаны і абясшкоджаны сем сігнальшчыкаў і больш за 20 дыверсантаў. Акрамя таго, людзі ў пагонах займаліся і ўмацаваннем Магілёва.



„Повторное"

ПАСВЕДЧАННЕ АБ ШЛЮБЕ
СВИДЕТЕЛЬСТВО О БРАКЕ

Грамадзянін / Гражданин Бурмистронок Владимир Филиппович (прозвішча, імя і імя па бацьку — фамилия, имя и отчество)
1909 года нараджэння / года рождения, Березница Березинского р-на Минской обл. (месца нараджэння — место рождения)
і грамадзянка / и гражданка Нестерович Татьяна Маркиановна
1923 года нараджэння / года рождения, Нестеровка Березинского р-на Минской обл.
уступілі ў шлюб / вступили в брак 19/VII-1945 г. девятнадцатого июля одна тысяча девятьсот сорок пятого года

аб чым у кнізе запісаў актаў грамадзянскага стану аб шлюбе / о чем в книге записей актов гражданского состояния о браке 1945 года июля месяца 19 числа зроблен адпаведны запіс за / произведена соответствующая запись за № 26
Пасля рэгістрацыі шлюбу прысвоены прозвішчы: / После регистрации брака присвоены фамилии: мужу Бурмистронок, жонцы / жене Бурмистронок
Месца рэгістрацыі / Место регистрации: Бюро ЗАГС Березинского р-на Минской обл.
Дата выдачы 14 сентября 1971 г.
М. П.
І-ПЯ № 008388
Загадчык бюро запісаў актаў грамадзянскага стану / Заведующий бюро записей актов гражданского состояния

Магілёўскі пісьменнік-гісторык Мікалай Барысенка піша ў сваёй кнізе «Дняпроўскі рубеж: трагічнае лета 1941-га»: «Штодня на будаўніцтва абарончых збудаванняў на ўскраіны горада выходзіла 10 - 15 тысяч чалавек. Частку з іх арганізоўваў і накіроўваў на працу абласны ваенны камісарыят, а частка збіралася работнікамі міліцыі непасрэдна на вуліцах горада. Былы начальнік 1-га аддзялення міліцыі Магілёва І. І. Галкоўскі ўспамінаў: «Даводзілася ўдзельнічаць у мабілізацыі насельніцтва на будаўніцтва абарончых умацаванняў, і трэба сказаць, што большасць ішло добраахвотна. У мяне быў штаб з 16 чалавек. Сустракаючы людзей на Першамайскай вуліцы, мы казалі: «Таварышы, давайце на абарончыя збудаванні». Збіралі чалавек па 500 - 700, вялі іх у раён Пашкава, цаглянага завода. Тут капалі равы».

# Ў шэрагах батальёна Уладзімірава

Што рабіў да вайны Міхаіл Бурмістронак, якім чынам трапіў у акружаны Магілёў і як сустрэўся са старэйшымі братамі, цяпер, хутчэй за ўсё, усталяваць немагчыма.

## Пытанні, пытанні, пытанні...

Пра тое, што адбывалася пасля 11 чэрвеня 1941 года, калі па ініцыятыве абласнога УНКУС быў сфармаваны міліцэйскі батальён, на чале якога стаў Канстанцін Уладзіміраў, У. Бурмістронак, які камандаваў у падраздзяленні ўзводам, распаўсюджвацца не любіў. «Лепш прамаўчаць», - нярэдка паўтараў ён дачцэ Раісе. Практычна ўсё, што ведае пра ваенныя подзвігі бацькі, яна запазычыла з больш позніх апавяданняў маці або ўрыўкаў размоў старэйшых.

- Цесць пра вайну не хацеў успамінаць. Я гэта заўсёды спісваў на выдаткі яго прафесіі: аператыўнікі, як правіла, немнагаслоўныя. Мне рэдка ўдавалася разгаварыць яго. Заўсёды пачынаў здалёк, з апавяданняў, як партызаніў мой бацька. Тады ён мог хоць штосьці сказаць пра батальён Уладзімірава. Нямецкі агонь па міліцэйскіх пазіцыях быў такім бязлітасным, што Уладзімір Піліпавіч нават не думаў, што з такога пекла можна выбрацца. Калі кананада сціхала, некаторы час вакол стаяла цішыня. Здавалася, не ацалеў ніхто. Потым адзін заварушыцца, другі... Значыць, жывыя! - дзеліцца Іван Коваль.

Ва ўспамінах ацалелыя байцы міліцэйскага батальёна называюць свайго калегу ў асноўным толькі па прозвішчы - Бурмістронак. Магчыма, таму дзеянні абодвух братоў аднеслі на рахунак аднаго Уладзіміра. Аднак не менш адважна дзейнічаў і Павел. Быў некалькі разоў паранены. Трэцяе раненне, атрыманае ў апошняй атацы, стала для яго смяротным.

Уладзімір не ўтойваў праўды пра гібель Паўла ад сваёй сям'і і суседзяў. Аднак папярэдзіў, каб тыя не прагаварыліся ўдаве: маўляў, такая навіна можа падкасіць Веру, а ёй трэба выстаяць у цяжкі ваенны час і падняць дзяцей. Але чуткі да яе ўсё ж дайшлі. А потым паступіла і афіцыйная інфармацыя.

Пры гэтым статус Паўла Бурмістронка вызначыць няпроста. Уладзімір, які яго хаваў, ведаў, што ён загінуў. Менавіта гэта Уладзімір Піліпавіч і напісаў у анкеце, якая знаходзіцца ў яго асабістай справе. Аднак, хутчэй за ўсё, даказаць гэта не змог. У той жа асабістай справе захоўваюцца запыты, якія накіроўваліся ў адзін з маскоўскіх архіваў у 1955 годзе. Адказ катэгарычны: «Сярод страт не лічыцца. Прапаў без вестак». Гэта ж пацвярджаюць і дакументы, якія можна ўбачыць на сайце «Памяць народа». Адзінае, што ў іх удакладнена - сувязь страчана ў пачатку вайны.

- Не так даўно жонка майго старэйшага сына, якая ездзіла на экскурсію ў Магілёў, вярнулася ў Мінск з навіной, што знайшла магілу майго бацькі. Маўляў, там ёсць нейкі мемарыяльны комплекс, на плітах якога выбіта яго прозвішча, - дзеліцца Галіна Багатка.

Аказалася, што гаворка ідзе пра... Буйніцкае поле. У сярэдзіне ўсталяванай там капліцы сапраўды ёсць спіс загінуўшых пры абароне Магілёва, чые імёны зараз вядомыя. І там сапраўды значыцца П. Бурмістронак. Аднак яго магілы там няма. Як прозвішча чалавека, які афіцыйна лічыцца без вестак прапаўшым, аказалася сярод афіцыйна загінулых і ці пра аднаго і таго ж чалавека ідзе размова - пытанні, адказ на якія «НС» пакуль знайсці не можа.

Існуе і яшчэ адна загадка, якая не дае спакою. Павел у дакументах, якія захоўваюцца на сайце «Памяць народа» і ў архіве Бярэзінскага раённага камісарыята, праходзіць як радавы. Аднак на адзінай фатаграфіі, якая засталася на памяць пра бацьку ў Галіны Багаткі, на пятліцах лёгка разгледзець чатыры трыкутніка, якія насілі старшыны. Гэта значыць, ён меў званне толькі на прыступку ніжэй, чым Уладзімір, які займаў не апошнюю пасаду ў абласным УУС. У той жа час у спісе байцоў батальёна міліцыі, які размешчаны на сайце Магілёўскага аблвыканкама, старшыной лічыцца... Уладзімір Бурмістронак. Зноў з двух братоў зрабілі аднаго? Так можа, радавы - гэта званне трэцяга брата, Міхаіла?



Галіна Паўлаўна Багатка

На жаль, яго лёс вядомы менш за ўсё. Па словах пляменніц, пасля акружэння ён ваяваў у Чырвонай Арміі. Калі вайна скончылася, прыязджаў да Уладзіміра. У асабістай справе старэйшага Бурмістронка ўдалося адшукаць фразу: «З'ехаў на Данбас, дзе, відаць, памёр». На жаль, ні ў Бярэзінскім ваенкамаце, ні на сайтах «Подзвіг народа», «Памяць народа» і «Мемарыял» не змагла знайсці ніводнага дакумента, які б пацвярджаў ці абвяргаў, што ён наогул змагаўся на палях Вялікай Айчыннай вайны.

## Сям'я герояў

А ці існаваў на пачатак вайны лейтэнант Бурмістронак? Цяпер адказаць на гэтае пытанне вельмі складана. Быў яшчэ і брат Мікалай. Пляменніцы практычна нічога пра яго не ведаюць, бо яго не стала яшчэ ў 1945-м.

- Бацька не любіў 9 Мая. Для яго гэта было не свята Перамогі, якую ён усімі сіламі набліжаў, а дзень жалобы. Чула, што дзесьці ў Германіі хтосьці блізкі яму загінуў менавіта ў гэты дзень. Праўда, тата ніколі пра гэта не гаварыў, - успамінае Раіса Уладзіміраўна.

Уладзімір Піліпавіч практычна нічога не піша пра Мікалая ў аўтабіяграфіі. Ёсць толькі радок у анкеце - «загінуў на франтах Айчыннай вайны». Крыху прыадчыняюць заслону таямніцы дакументы, размешчаныя на сайце «Памяць народа».

Мікалай Піліпавіч служыў у Чырвонай Арміі ў 1937 - 1939 гадах. Якое тады насіў званне - невядома. У многіх дакументах значыцца, што на Вялікую Айчынную яго заклікаў у 1941-м Бярэзінскі РВК, а ў адным з узнагародных лістоў паказаны месяц, калі гэта здарылася, - снежань. Што рабіў ён першыя паўгода, пакуль сказаць складана.

Наступныя звесткі датуюцца пачаткам 1944-га. «Падчас наступу на населены пункт Чырык-2 Джанкойскага раёна Крымскай АССР, дзейнічаючы смела і рашуча, яго ўзвод абыходным манёўрам зайшоў праціўніку ў фланг, адным з першых уварваўся ў вёску і завалодаў заходняй яго ўскраінай. Пры гэтым знішчана звыш 30 нямецка-румынскіх афіцэраў». За гэты подзвіг Мікалай Піліпавіч прадстаўлены да ордэна Чырвонай Зоркі. На жаль, званне Бурмістронка і тут не паказана.



Раіса Уладзіміраўна Коваль з унукам Аляксандрам

Сакавіком 1945-га датуюцца яшчэ два ўзнагародных ліста. Тут ужо відавочна, што Мікалай Піліпавіч лейтэнант і камандуе стралковай ротай 448-га стралковага палка.

«Таварыш Бурмістронак у баях з нямецкімі захопнікамі за населены пункт *(на жаль, назва не разборліва. -* **Аўт.**) 10.02.1945 умела кіраваў ротай у баі, у выніку рашучай атакі праціўнік быў выбіты з населенага пункта, не нясучы пры гэтым ніякіх страт…» - чытаем на сайце «Памяць народа». За гэтую бітву афіцэр таксама прадстаўлены да ордэна Чырвонай Зоркі.

Праз месяц - яшчэ адзін подзвіг. «У баях на подступах да населенага пункта Грос-Клюсаў 4.03.1945 смела і рашуча атакаваў роты праціўніка, выбіў праціўніка з траншэі, пераследуючы адступаўшага праціўніка, які ўварваўся ў населены пункт і ачысціў яго ад праціўніка», - распавядае сайт «Памяць народа». У гэтым баі Мікалай Бурмістронак атрымаў трэцяе з вядомых нам раненняў (да гэтага 8 красавіка і 20 верасня 1944 года). Аднак на гэты раз пашкоджанні аказаліся несумяшчальныя з жыццём. 5 сакавіка 1945 года афіцэра не стала. Да ордэна Айчыннай вайны ІІ ступені ён прадстаўлены пасмяротна. Яго пахавалі ў нямецкай вёсцы Забес.

Хутчэй за ўсё, Мікалай не быў жанаты, бо па ўсіх дакументах праходзіць толькі яго маці - Праскоўя Дзям'янаўна. Аднак напрыканцы вайны не было ў жывых і яе. Таму магчыма, што праз два месяцы, у дзень усеагульнай радасці, вестку пра яго смерць атрымаў брат Уладзімір.

Дарэчы, Уладзімір, Павел, Міхаіл і Мікалай - яшчэ не ўсе героі сям'і Бурмістронкаў. Абодвух сыноў страціў на вайне іх старэйшы брат па бацьку Іван Піліпавіч. Ён і сам змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, але ацалеў. Пётр Іванавіч абараняў горад на Няве, яго дзеянні адзначаны медалём «За абарону Ленінграда». У кастрычніку 1943-га (яму было ўсяго 23) хлопец атрымаў асколачныя раненні. Праз два дні яго не стала. Пахаваны на Піскароўскіх могілках у Санкт-Пецярбургу. Пра лёс яшчэ аднаго сына Іван Піліпавіч так нічога і не даведаўся - той прапаў без вестак.

- Дзядзька не знаходзіў сабе месца да канца жыцця. Так і казаў, што лепш бы сам замест сыноў у зямлю лёг, - распавядае Галіна Паўлаўна Багатка.

## Гору няма канца

Пасля гібелі міліцэйскага батальёна Уладзімір Бурмістронак, нягледзячы на раненні, не вярнуўся дадому, а пайшоў выганяць ворага з роднай зямлі. Праз некалькі дзён трапіў да народных мсціўцаў. Яго паслужны спіс сведчыць, што з ліпеня 1941 года па сакавік 1942-га ён разам з Ільёй Іванавічам Галкоўскім (вось ужо жыццё звязала гэтых двух супрацоўнікаў!) арганізоўваў партызанскі рух на Магілёўшчыне.

Неўзабаве Уладзімір Піліпавіч страціў сям'ю. Нямецкая бомба трапіла ў дом, дзе жылі Марыя з дзецьмі. Жонка і дачка загінулі, а сын у той момант дзесьці гуляў. Суседзі распавялі, што хлапчук каля тыдня прыходзіў на папялішча. На жаль, ніхто не прытуліў яго. А потым ён знік. Няшчасны бацька да канца дзён шукаў сына - ездзіў у Магілёў, пісаў у дзіцячыя дамы, у архівы...

- Стрыечныя сёстры і зараз раяць мне працягнуць пошукі старэйшага брата. Але столькі вады ўцякло… - наракае Раіса Коваль.

Калі Уладзімір ужо ваяваў у партызанскім атрадзе № 20, народныя мсціўцы вынеслі смяротны прысуд яго аднавяскоўцу, з-за даносу якога загінула нямала людзей. Прыводзіў прысуд у выкананне ў тым ліку і Уладзімір. Жонка здрадніка паклялася адпомсціць: «Наша кроў пралілася - пральецца і ваша, Бурмістронкі». Неўзабаве немцам стала вядома, што ў Праскоўі два сыны змагаюцца ў Чырвонай Арміі, а адзін - у партызанах. Яе дачку Хадосю, муж якой таксама ваяваў, перад расстрэлам прымусілі выкапаць магілу для сябе і дваіх яе дзяцей, малодшаму з якіх было ўсяго некалькі тыдняў. Потым закатавалі пасынка Мікіту (сына Піліпа ад першага шлюбу). Дарэчы, менавіта яго ўнучка выпадкова прачытала ў «НС» артыкул «Там, дзе ручай у цішы світанак сустракае...». Пазней у Праскоўі не вытрымала сэрдца, і яна памерла. А сям'я Паўла ацалела. У «расстрэльным» спісе была і Вера, але калі да яе падышоў немец, яна, успомніўшы наказ мужа, назвалася Астапчык.

З вайны Уладзімір Бурмістронак вярнуўся зусім другім чалавекам - стаў замкнёным. Аднак цяжкі душэўны стан не адбіўся на яго прафесійнай дзейнасці. Ён змагаўся са злачыннасцю гэтак жа адважна, як і з нямецкімі захопнікамі. У маі мінулага года «НС» падрабязна распавяла пра службовыя заслугі афіцэра. Ён звольніўся з органаў унутраных спраў па стане здароўя ў званні маёра. Потым працаваў старшынёй райспажыўсаюза, сельпо, а таксама рэвізійнай камісіі. На апошняй пасадзе скрупулёзна знаходзіў кожную страчаную капейку.

У ліпені 1945 года Уладзімір Піліпавіч стварыў другую сям'ю. З жонкай Таццянай гадаваў чацвярых дзяцей. Дарэчы, дачок назваў гэтак жа, як і яго брат Павел - Галіна і Раіса. Але жорсткі лёс распарадзіўся так, што дачка аднаго - Раіса Паўлаўна і другога - Галіна Уладзіміраўна памерлі ў дзяцінстве.

...Пакуль, напэўна, адназначна сказаць немагчыма, колькі ж Бурмістронкаў змагалася ў шэрагах батальёна Уладзімірава. Калі матэрыял рыхтаваўся да друку, стала вядома пра артыкул з часопіса «Савецкая міліцыя», які распавядае яшчэ і пра курсанта Мінскай школы міліцыі старшыну Анатоля Паўлавіча Бурмістронка. Пакуль відавочны толькі той факт, што ў даследчыкаў атрымаўся зборны вобраз байца-героя. І наогул у справе пра легендарны батальён нямала белых плям. Магчыма, праца, якую вядуць сучасныя даследчыкі, значна паменшыць іх колькасць.

«НС» працягне сачыць за развіццём падзей.

*Вольга КАЗДЗЕРКА.*
*Фота аўтара, з сямейных архіваў Р. У. КОВАЛЬ і Г. П. БАГАТКІ.*